Еще одно новшество, внесенное Махтумкули в туркменскую литературу – конкретное описание поэтического образа туркменской девушки, застенчивой, скромной. Таким образом, в стихах поэта нашла отражение жизнь туркмен во всех ее проявлениях.

Необходимо сказать о стилистических особенностях поэзии Махтумкули. Его поэзия буквально переполнена поэтическими образами, которые переливаются подобно волнам в море, создавая неповторимый поток почти визуальных впечатлений. Творчество Махтумкули воздействует на читателя многообразно – через смысловое наполнение и воображение, через мысль и художественные символы.

Опоэтизированный мир Фраги впитал в себя формировавшуюся на протяжении тысячелетий философию туркменской нации, мелодии народной души.

До наших дней сохранилось более 700 стихотворений и около 10 небольших поэм. 80% их них встречаются в рукописях, остальные записаны из уст народа.

В творчестве Махтумкули Фраги нашла отражение жизнь туркмен со всеми радостями и горестями, победами и поражениями. Вечны авторитет поэта, его место в исторической, общественно-политической и культурной жизни нации.

*УДК 811.161.3*

# РОЛЯ ЯНКІ КУПАЛЫ Ў РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

*У.А.Ільмоўскі – студэнт 1 курса БДАТУ*
*Навуковы кіраўнік – ст. выкладчык А.Б.Гурновіч*

XIX - XX стст. – час інтэнсіўнага развіцця беларускай літаратурнай мовы, выпрацоўкі і замацавання яе графіка–правапісных, фанетычных, марфалагічных і лексічных нормаў.

Многія асаблівасці беларускай мовы былі адлюстраваны ў мастацкіх і публіцыстычных тэкстах XIX ст., вызначыліся тэндэнцыі да перадачы фанетычных рысаў, пэўных марфалагічных, лексічных адметнасцяў, але агульнапрынятых і абавязковых нормаў выпрацавана не было.

Па гэтай прычыне пісьменнікі пачатку XX ст. пры напісанні і выданні сваіх твораў павінны былі самастойна выпрацоўваць нормы літаратурнай мовы, арыентуючыся на сваю родную гаворку і ўлічваючы працу папярэднікаў. Таму важнае значэнне ў гэты перыяд маюць моўнае чуццё, моўны густ аўтараў, уменне заўважыць найбольш тыповыя, зразумелыя ўсім беларусам рысы і адлюстраваць іх у творах. У гэты час узрастае роля асобы, здольнай даць узор правільнага выкарыстання мовы, на які будуць арыентавацца іншыя, і такім аўтарытэтам у беларускай культуры стаў Янка Купала.

Ролю Янкі Купалы, аднаго з самых яркіх, таленавітых і аўтарытэтных беларускіх майстроў слова, ў развіцці, станаўленні у нармаванні беларускай літаратурнай мовы ў гэты перыяд нельга перааценіць. Ён актыўна ўдзельнічае ў працэсе фарміравання і замацавання нормаў беларускай літаратурнай мовы як пісьменнік і рэдактар, член правапіснай камісіі пры Інбелкульце. Моватворчасць паэта становіцца ўзорам для пісьменнікаў малодшага пакалення. У самых ранніх творах заўважаецца неабыякавасць паэта да роднай мовы, прасочваецца свядомы адбор мастацка-выяўленчых і моўных сродкаў. Янка Купала з пашанаю ставіцца да роднага слова, бо, як піша сам: «Самы важнейшы і непраломны закон жыцця - гэта людская мова, праз каторую чалавек стаў найвышэй ад усякага стварэння пад сонцам» [1, с.34]. Важным этапам у станаўленні Янкі Купалы як паэта, знаўцы мовы стала супрацоўніцтва з газетай «Наша Ніва», знаёмства з узорамі розных гаворак, што дапамагло паэту задумацца над праблемамі развіцця беларускай мовы, уважліва прыгледзецца да роднай гаворкі, вызначыць агульнапашыраныя рысы, выпрацаваць, удасканаліць моўны густ. Таму ў творах Янкі Купалы ранняга перыяду выразна выяўляюцца дзве тэндэнцыі: папершае, да замацавання рысаў, характэрных яго роднай гаворцы, па-другое, імкненне прытрымлівацца агульнапашыраных рысаў, якія ёсць у большасці іншых беларускіх гаворках.

Мова ранніх Купалавых твораў адлюстроўвае агульныя працэсы фарміравання беларускай літаратурнай мовы і ўласнае разуменне шляхоў яе развіцця, выяўляе яго моўную інтуіцыю, спецыфіку адбору моўна-выяўленчых сродкаў пры адсутнасці кадыфікаваных нормаў.

Графіка-правапісныя нормы беларускай літаратурнай мовы выпрацоўваюцца ў ХІХ-пач. ХХст., вядучую ролю ў іх замацаванні адыграла газета «Наша ніва», якая да кастрычніка 1912 года выходзіла і на кірыліцы (грамадзянцы), і на лацінцы. На яе старонках вядзецца дыскусія аб тым, які шрыфт больш адпавядае пісьмовай традыцыі беларусаў. Друкуюцца тут і іншыя артыкулы па пытаннях развіцця беларускай мовы. «Наша Ніва» спрыяе выпрацоўцы і пашырэнню прынцыпаў правапісу (фанетычнага - для галосных, марфалагічнага - для зычных, этымалагічнага - для іншамоўных слоў), замацаванню марфалагічных і лексічных нормаў, ускладненню сінтаксісу, выпрацоўцы беларускай нацыянальнай тэрміналогіі. У гэтым немалая заслуга і Янкі Купалы, які быў супрацоўнікам, а пасля пэўны час і рэдактарам газеты.

Мова ранніх твораў Янкі Купалы выразна адлюстроўвае сувязь з жывой гутарковай мовай, таму ў творах паэта, апублікаваных у «Нашай ніве», выяўляюцца ўсе важнейшыя фанетычныя рысы беларускай мовы, якія пазней замацаваліся ў якасці літаратурнай нормы: поўнае недысіміляцыйнае аканне: сухажылля, халоднага, яканне (пераважна у першым пераднаціскным складзе): ня змог, ня тое, пераход [в], [л] у [ў]: паплылі ў даль, маўчыць, зацвярдзенне шыпячых: сказаўшы, жывы, зацвярдзенне этымалагічнага [р']: карэнчык,

прыдзі, зацвярдзенне этымалагічнага [ц']: ваконцэ, сэрцэ, прыстаўныя галосныя і зычныя: вочы, восень, гэты, дзеканне: павядзі саладзі, цеканне: маўчыць, маці. Праўда, пры фіксацыі некаторых фанетычных з'яў заўважаецца непаслядоўнасць, абумоўленая адсутнасцю кадыфікацыі гэтых нормаў. Прасочваецца фанетычны прынцып напісання у прыкладах асіміляцыі па мяккасці зычных: зьвініце, вясельля, па глухасці: с князем, с табой [3]. У першых публікацыях сустракаюцца асобныя фанетычныя дыялектызмы, пасля кадыфікацыі беларускай літаратурнай мовы яны замяняюцца агульнапрынятымі: прыдзі - прыйдзі, усьмехаюцца - усміхаюцца.

Важную ролю ў творах паэта адыгрывае дзеяслоў. Пры дапамозе дзеяслова ствараюцца метафары: думку прывядзі, увасабленні: пляцецца ночка-чараўніца, параўнанні: віцца будзеш, як вужака і інш.

Формы дзеясловаў у творах Янкі Купалы шматлікія і разнастайныя. Найбольш пашыраныя формы дзеясловаў 3 асобы адзіночнага і множнага ліку. Асаблівасцю мовы твораў з'яўляецца выкарыстанне дзеясловаў 2 спражэння ў форме 3 асобы адзіночнага ліку без фінальнага -ць: бароне, марудзе, Такія формы, уласцівыя сярэднебеларускім гаворкам, шырока ўжываюцца ў творах папярэднікаў Янкі Купалы, пісьменнікаў і паэтаў пачатку ХХст. У пазнейшых выданнях твораў Янкі Купалы дыялектныя дзеяслоўныя формы замяняюцца агульнапашыранымі кадыфікаванымі: гамоне - гамоніць, ходзе – ходзіць.

Дзеясловы 2 спражэння ў форме 3 асобы множнага ліку ўжываюцца з канчаткам -уць(-юць): прыносюць, валочуць, што таксама не рэдкасць для беларускай літаратурнай мовы XIX-пач. ХХст. Пазней такія формы замяняюцца нарматыўнымі: прыносяць, валочаць.

Дзеясловы ў форме 1 асобы множнага ліку выступаюць часта націскным фінальным -ём: жывём, пяём, што ўласціва большасці беларускіх гаворак.

Адметнасцю мовы Купалавых твораў гэтага часу з'яўляецца ўжыванн разнастайных і шматлікіх формаў загаднага ладу, што абумоўлен публіцыстычным характарам яго паэзіі.

Адзначым таксама ролю Янкі Купалы ў выпрацоўцы лексічных норма літаратурнай мовы, замацаванні ў творах лексічнага багацця родна гаворкі. Мова Купалавых твораў багатая і разнастайная, адлюстроўва самыя розныя тэматычныя пласты лексікі ад прыродаапісальнай, бытаво да грамадска-палітычнай, выразна перадае сувязь з народна-гутарковa мовай, мовай вусна-паэтычнай творчасці.

Янка Купала прыняў самы актыўны ўдзел у адраджэнні беларуска культуры, літаратуры, мовы, у пашырэнні беларускай мовы ў грамадств у павышэнні яе аўтарытэту. Нямала зроблена ім для ўнармаван беларускай літаратурнай мовы, выпрацоўкі і замацавання графік правапісных, лексічных, фанетычных, марфалагічных, стылістычных арфаэпічных нормаў. Агульныя тэндэнцыі фарміравання беларуск літаратурнай мовы выяўляюцца ўжо ў самых ранніх творах Янкі Купал

таму параўнанне першых публікацый твораў і пазнейшых, дапрацаваных і ўдасканаленых, дае магчымасць прасачыць адметнасці адбору моўна-выяўленчых сродкаў і вызначыць, якія з асаблівасцяў мовы Купалавых твораў сталі нарматыўнымі, а якія на сённяшні дзень нормай літаратурнай мовы не з'яўляюцца.


1. Купала, Янка / Янка Купала. Поўны збор твораў. У 9 т. Т.8. Артыкулы, нататкі, выступленні. Калектыўныя творы. - Мінск: Мастацкая літаратура, 2002. - 462 с.

2. Усціновіч, Г.К. «Наша ніва» /Беларуская мова: Энцыклапедыя. -Мінск: «Беларуская энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 1994. - С.384-386.

3. Бобрык, У.А. Індывідуальныя купалаўскія словаўтварэнні //Беларуская мова. Вып. 9. - Мінск: Выд-ва БДУ імя У.І. Леніна,1981 -С.38-47.



*УДК 811.161.3*


## ІГНАТ ДАМЕЙКА – ВУЧОНЫ, ЛІТАРАТАР, МАСТАК


*В.У. Тарас – студэнт 1 курса БДАТУ*
*Навуковы кіраўнік – ст. выкладчык А.Б.Гурновіч*


У развіццё сусветнай навукі, літаратуры, мастацтва ўнеслі значны ўклад беларусы, выхадцы з нашай зямлі. Многія імёны шырокавядомыя ў свеце, але, на жаль, яшчэ малавядомыя на сваёй радзіме. Адзін з такіх людзей – Ігнат Дамейка, нацыянальны герой Чылі.

Нарадзіўся Ігнат Дамейка 31 ліпеня 1802 года ў радавой сядзібе Мядзведка (сёння Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці). Страціўшы ў сем гадоў бацьку, дзяцінства Ігнат правёў у маёнтку Жыбуртоўшчына Лідскага павета. Яму было чатырнаццаць гадоў, калі ён скончыў Шчучынскую школу і стаў студэнтам фізіка-матэматычнага факультэта Віленскага ўніверсітэта, дзе пачаў старанна вывучаць выбраныя ім навукі: біялогію, хімію, матэматыку, адначасова наведваючы лекцыі прафесараў па літаратуры і гісторыі.

Пасля заканчэння ўніверсітэта Дамейка атрымаў ступень магістра матэматыкі, але юнак не спяшаўся развітвацца з універсітэтам. Яму хацелася глыбей вывучыць гісторыю, літаратуру, мову. Акрамя беларускай, польскай і рускай моў, ён ужо добра ведаў англійскую і французскую, вывучаў нямецкую і латынь. Цікавілі яго і гісторыя, архітэктура, геадэзія. Акрамя таго, затрымлівалі маладога чалавека ва ўніверсітэце, у Вільні, і абавязкі ў Таварыстве філаматаў.

Таварыствы філаматаў і філарэтаў, якія існавалі ў 1817-1823 гг. ў асяроддзі студентаў Віленскага ўніверсітэта, выхавалі пляяду такіх людзей, як Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ян Чачот і многіх іншых, сярод якіх быў і Ігнат Дамейка. Задачамі гэтых таварыстваў была асвета сваіх землякоў, самаўдасканаленне, стварэнне падручнікаў для народнай адукацыі, галіновых